ISSN 1899-9018
Nr indeksu 371416

сами о собі
сами о себе
самі про себе
самі пра сябе
samiosobie
miesięcznik społeczno kulturalny /160/ marzec 2022



# Падляшская зямля дыхае святасцю

Амаль два гады таму назад, 25 ліпеня 2020 года, у манастыры св. Кацярыны ў Залешанах адбылася кананізацыя 79 мучанікаў з вёскі Старыя Пухалы (вазакоў), Шпакі, Волька Выгоноўская, Залешаны і Зане. Пасля заканчэння другай сусветнай вайны аддалі яны сваё жыццё за праваслаўную веру. Зімою 1946 года загінулі з рук польскага ўзброенага падполля з атраду капітана Рамуальда Райса псеўд. „Буры”. Другога лютага 2022 года вернікі з Браньска і навакольных вёсах ды паломнікі сабраліся ў храме св. Сімяона Стоўпніка, каб памаліцца да мучанікаў занеўскіх і шпакоўскіх.

Гэтая новая, прыгожая царква была пабудаваная па ініцыятыве мітрапаліта **Васілія** (**Дарашкевіча**), стараннем настаяцеля малешоўскага прыхода а. **Васілія Негерэвіча** і яго наступніка а. **Георгія Харытанюка**. Праваслаўных верных у гэтым горадзе з багатым мінулым засталося цяпер няшмат. **Валянціна Такаюк**, жыхарка Браньска, актыўная прыхаджанка, удзельніца урачыстасцяў, гаворыць пра праблемы, з якімі мусіць змагацца праваслаўная супольнасць: – Калі некалькі дзесяткаў гадоў таму назад пераехала я жыць ў Браньск, нас было 15 сем’яў. Час ішоў, а нас было ўсё менш і менш. Цяпер у самім Браньску толькі восем праваслаўных дамоў, а у маіх родных Свірыдах дзевяць (у 1960-ыя гады было іх яшчэ 30). Да канца дзевяностых маліліся мы ў старой, драўлянай царкве, будынак якой быў калісьці школай. Цяпер у нас новая царква, з якой вельмі цешымся і якою ганарымся. Мы малая, але дружная супольнасць. Яшчэ больш нас з’яднала будова царквы.



Спадарыня Валянціна Такаюк некалькі дзесяткаў гадоў кіравала Домам сацыяльнай дапамогі ў Браньску. Як мала хто ведае праблемы гэтай зямлі. Яе продкі ад вякоў былі з ёю звязаныя. Заўсёды актыўныя ў жыцці тутэйшай супольнасці, былі людзьмі веруючымі і царкоўнымі. Бацька спадарыні Валянціны **Аляксандар Колас**, падобна як дзедка **Афанасій**, быў вясковым летапісцам. Збераглося некалькі дзесяткаў рукапісных сшыткаў з іх занатоўкамі ў форме дзённіка, якія ахопліваюць гады 1932-1997. У будучыні пастараемся крыху прыблізіць іх змест.

Падчас сустрэчы ў Браньску спадарыня Валянціна Такаюк сказала нам яшчэ: – Нарадзілася я ў Свірыдах, якія знаходзяцца два кіламетры ад Занёў. Там пасля вайны здарылася трагедыя. У нашай вёсцы, колькі памятаю, шмат гаварылася пра крыўду нашых суседзяў. Праваслаўныя жыхары Занёў былі людзьмі ўбогімі, якія зусім не ангажаваліся ў палітычнае жыццё. Яны проста змагаліся за свой быт і хлеб штадзённы. Таму расказы пра тое, што мясцовае насельніцтва супрацоўнічала з СБ трэба адносіць да казак.

Як сведчаць дадзеныя з „Іспаведных ведамасцяў" браньскага праваслаўнага прыхода, у 1910 годзе ў Занях жыло 166 праваслаўных жыхароў, у суседніх Свірыдах – 312, а ў Браньску – 173 асобы. Некалькі праваслаўных семяў пражавала і ў іншых мясцовасцях – Залускіх, Алексіне, Кліхах, Патоках, Кальніцы, Даманове, Керсноўку, Рудцы, Алендах, Галёнках і Анацках. У 1910 годзе ўвесь браньскі, праваслаўны прыход налічваў 879 вернікаў.

У міжваенны час браньскі прыход быў ліквідаваны і далучаны да філіяльнага прыхода ў Малешах. У 1936 годзе мураваны храм у Браньску польскія ўлады разабралі і толькі ў перыяд нямецкай акупацыі браньшчане змаглі адапціраваць пад храм стары, драўляны школьны будынак. У 1942 годзе, калі настаяцелем малешоўскага прыхода быў а. Іаан Бандалоўскі, у Малешах пражывала 507 праваслаўных жыхароў, Браньску – 124, Буйнове – 261, Свірыдах – 249, Шпаках – 184, Занях – 169, Хаеве – 102, Фэрме – 79 і Керсноўку – 45 асобаў. Увесь малешоўска-браньскі прыход налічваў тады 1852 вернікаў. Сёння іх тут не больш 200 чалавек.



Столькі гістарычных фактаў пра даўняе праваслаўнае насельніцтва браньскай зямлі, вернемся яшчэ да лютаўскіх урачыстасцяў.

Святую літургію ў бранскай царкве ўзначаліў а. **Андрэй Якімюк**, настаяцель прыхода ў Дубічах Царкоўных. З ім служыў а. **Марк Якімюк**, настаяцель прыхода ў Малешах ды а. ігумен **Пафнуцій** (**Якімюк**). Падчас пропаведзі а. Андрэй высока ацаніў духоўнае жыццё браньшчан. Заўважыў, што новая царква з'яўляецца сведчаннем Божай прысутнасці пасля трагічных здарэнняў мінулага: – Гэтая царква ўзнікла як фенікс з попелаў. Чалавечы боль можа быць аграмадны, але Божая міласэрнасць і любоў – бязмерная. Тут, на гэтай зямлі, у вельмі трагічным для праваслаўнага народу часе, была перакрэсленая



*Малітва ля помніка ў Шпаках, гаворыць а. Андрэй Якімюк, другі злева а. Марк Якімюк, 2 лютага 2022 г.*

*Інтэр’ер царквы ў Браньску, 2 лютага 2022 г.*

ідэя хрысціянства. Пасля гадоў, дзякуючы жменьцы малой, але моцнай духоўна супольнасці, узнікла царква. Тутэйшыя веруючыя людзі з’яўляюцца ахоўнікамі праваслаўнай спадчыны гэтай зямлі. У сучасным свеце, які не разумее патрэбаў праваслаўных хрысціян, асабліва важная малітва да падляшскіх мучанікаў. Бо яны памерлі за тое, каб мы маглі на гэтым месцы служыць Святую літургію і сведчыць аб праваслаўнай веры на гэтай зямлі. Нягледзячы на тое, што мінулае трагічнае ды баліць, мы радуемся, што можам маліцца да святых, якія адыйшлі за веру.

Айцец Андрэй называе Браньск і яго ваколіцу „падляшскай галгофай”. Адклікаецца пры гэтым да ўласных успамінаў: – Калі я вучыўся ў духоўнай семінарыі, не даацэньваў нашых земляў, лічачы іх бязплоднымі на мучанікаў ці святых. Аказалася, што падляшская зямля дыхае святасцю. Шанаванне святых мучанікаў не з’явілася адразу, мусіў прайсці нейкі час, каб яно выявілася. Гэта можна параўнаць да дуба, які расце памалу і пасля стае разгалістым дрэвам. Толькі ад нас залежыць, ці памяць пра святых і гэтыя здарэнні перакатрывае ў наступных пакаленнях.

Па-мойму, можна за гэта быць спакойным. Доказам таго з’яўляецца хаця бы маладая ліцэістка з Бельска Падляшскага **Вікторыя Гаць**. Яе карані па бацьку ідуць ў вёску Буйнова малешоўскага прыхода, а бабуля паходзіць з Занёў. У самім Бельску Вікторыя вядомая як удзельніца беларускіх, вакальных калектываў, у тым ліку фальклорнай групы Жэмэрва. Дзяўчына цяпер пастаянна прыязджае ў Браньск, родныя старонкі дзядоў, каб правіць мясцовым, царкоўным хорам. Сваім малітоўным, мілагучным голасам яна ўпрыгожвала таксама свята ў гонар мучанікаў.

Несумненна, вялікі уплыў на музычнае, царкоўнае выхаванне Вікторыі мае вопыт старэйшага пакалення. У малешоўскім прыходзе такім аўтарытэтам з’яўляецца спадарыня Ніна Колас, шматгадовы псаломшчык і кіраўнік хору ў Малешах і Браньску. Царкоўным харыстам, выдатным спеваком быў таксама бацька спадарыні Ніны – **Іван Хомка**. Спадарыня Ніна з’яўляецца адной з гераіняў фільма „Прывэлі нас сюды песні Вашых батькоўв”.

Айцец Марк Якімюк, настаяцель прыхода ў Малешах, так гаварыў пра вопыт душпастырскай працы на бранскай зямлі: – Шмат асобаў не верыла, што ў гэтым месцы будзе Божы храм. Але сказана: „Чалавек плануе, а Бог выконвае”. Дзякуючы Божай дапамозе чарговы раз сустракаемся на малітве у Браньску, Занях і Шпаках. Пачыналі мы ўспамінаючы замардаваных жыхароў, цяпер просім пра малітву мучанікаў. Калі я тут стаў настаяцелем, на магілы прыходзіла сем асобаў. У 2020 годзе Святую літургію ўзначаліў сам архіепіскап бельскі Грыгорый. Маліцца трэба таксама аб злачынцах. Прабачэнне гэта сапраўдная хрысціянская пазіцыя.

На пытанне, як трэба адносіцца да маршаў правакатараў-нацыяналістаў у Гайнаўцы, а. Марк сказаў: – Блакіраваць дарогу, класціся на ёй – гэта не спосаб. Больш разумнае, што мы праваслаўныя можам зрабіць, гэта малітва са свечкай у руцэ.

Пасля кароткай сустрэчы з абедам у святліцы ў Свірыдах, усе прысутныя на ўрачыстасці падаліся ў вёску Зані. Халодны, снежны пачатак лютага спрыяў рэфлексіі. Месца памяці – могільнік з астанкамі мучанікаў, знаходзіцца за вёскай, сярод палёў. Некалькі сотняў метраў за вёскай можна заўважыць агароджаную купку дрэваў і крыжы. Гэта тут, у маленькай даліне, схаваныя ад свету, спачываюць занеўскія мучанікі. Да месца памяці вядзе абсыпаная снегам, жвіраваная дарога, па якой у мокрыя пары года цяжка праехаць. Гэты вобраз так кантрастуе з дагледжанымі за вялікія сродкі іншымі месцамі польскай нацыянальнай памяці.

На магілах 24 мучанікаў быў адпраўлены малебен, на які прыбылі праваслаўныя жыхары Занёў. Некаторыя з іх вельмі эмацыйна ўспрымалі малітву, бо ж яны нашчадкі тых, якіх успамінаем. Занеўская зямля гэта для іх дар, атрыманы ад продкаў. Да вайны людзі адчувалі тут сябе, як на бацькаўшчыне.

Мяняліся ўрады, палітычныя партыі, толькі зямля аставалася такою жа ад вякоў. І тады, калі хтосьці прыняў рашэнне, што няма тут для іх месца, яны сталіся чужымі на сваёй, роднай зямлі – такія словы перадаў вернікам мітрапаліт Сава падчас урачыстасці кананізацыі мучанікаў з Занёў і Шпакоў. Дзякуючы ім і падтрымцы Царквы людзі перастаюць баяцца гаварыць пра мінулае. Прысутнасць святых дае ім сілы, а падтрымкай з’яўляюцца таксама паломнікі, якія моляцца за іх родную зямлю.

У Шпаках помнік – сімвалічная магіла загінуўшых васьмі жыхароў, знаходзіцца ў цэнтры вёскі. Тут таксама быў адслужаны малебен з удзелам жыхароў вёскі.

Шанаванне падляшскіх мучанікаў, як слушна заўважыў а. Андрэй Якімюк, трэба даглядаць і перадаваць наступным пакаленням.

Малітоўная, але таксама матэрыяльная падтрымка супольнасці прыхода Малешы і Браньска – неабходная. Яна патрабуе духоўнай дапамогі звонку. Святая зямля малешоўская, занеўская і шпакоўская павінна стаць для жыхароў Падляшша адным з фундаментаў веры.

**Максім Фіонік**
фота **аўтара**
і **Беларускае радыё Рацыя**

# Мур на мур

Польская Памежная ахова на твітары: «Пачалося будаўніцтва запоры на польска-беларускай мяжы. Сёння памежная ахова перадала будаўнічыя пляцоўкі выканаўцам. Гэта самая буйная будаўнічая інвестыцыя за ўсю гісторыю Памежнай аховы, даўжыня запоры складае 186 км і каштуе 1,6 мільярда злотых».

Яшчэ раней. Белавежская пушча. 20 зуброў загразлі ў смяротнай пастцы паміж польскімі і беларускімі заблытаннямі. Актывісты «Польшча 2050» інтэрвеніююць у прэм'ер-міністра і падляшскага ваяводы ў справе гэтых зуброў, якія загразлі паміж польскім і беларускім калючым дротам на польска-беларускай мяжы.

Звярнулася з інтэрвенцыяй да ваяводы 20 студзеня **Ганна Гіль-Пёнтэк**, дэпутатка «Польшчы 2050», каардынатар гэтага руху па пытаннях мясцовага самакіравання, былы ваявода і падлшяскі віцэ-маршалак **Мацей Жыўна** і **Катажына Ягела** з экалагічнай рады «Польшчы 2050».

**Адам Вайрак**: – На жаль, адбылося тое, чаго я спадзяваўся і пра што папярэджвалі многія спецыялісты. Паміж платамі ў Пушчы стварыліся кішэні, якія сталі смяротнай пасткай для жывёл. Каля 20 зуброў замкнёныя паміж беларускай «сістэмай» і польскай «канцэрцінай». Гэта даволі пэўная інфармацыя, якая паходзіць з беларускіх і польскіх, назавем гэта – вайсковых крыніц. Гэтыя зубры – нашы зубры, якія звычайна пераходзілі мяжу і даходзілі да беларускай мяжы, часам глыбока на ўсход, нават да 2 км. Іх вяртанне спыніў калючы дрот. Беларусы пакуль не зацікаўленыя нічога з гэтым рабіць, таму я звяртаюся да польскіх улад з просьбай неадкладна адрэагаваць і развесці агароджу на нашым баку і дазволіць зубрам вярнуцца. Зрабіце што-небудзь, да халеры! Уся адказнасць за пакуты гэтых жывёл таксама ляжа на вас!

Мацей Жыўна: – Калі спецслужбы змогуць кантраляваць мяжу і разрэзаць канцэрціну, каб выкінуць на беларускі бок чарговую групу імігрантаў, пытанне: чаму яны не могуць адпусціць гэтых жывёл назад на польскі бок?

Тыдзень раней на сайце Беларускай памежнай службы з’явілася паведамленне: «Вечарам 12 студзеня беларускія памежнікі знайшлі мёртвага зубра каля агароджы з калючага дроту з польскай часткі Белавежскай пушчы. Сляды на зямлі сведчаць аб тым, што жывёла спрабавала перабрацца праз агароджу і праз нейкі час памерла ад знясілення. Калі прыехалі супрацоўнікі Нацыянальнага парку [беларускага], яны заявілі, што зубр паходзіць з насельніцтва, якое пражывае на польскім баку пушчы. Восенню статак сезонна мігрыраваў у Беларусь, а з надыходам халадоў вяртаўся на зімовы нагул у Польшчу. Аднак польскія ўлады паставілі агароджу з калючага дроту, каб прадухіліць міграцыю жывёл. «Канцэрціна – брытвенны дрот наносіць несумяшчальныя траўмы жывёлам і з'яўляецца смяротнай перашкодай для іх перамяшчэння. Таму пры будаўніцтве новых і мадэрнізацы існуючых беларускіх інжынерных агарodж і сігнальных комплексаў на дзяржаўнай мяжы прадугледжаны спецыяльныя шчыліны і праходы для забеспячэння міграцыі дзікіх жывёл».

Планавалі паставіць плот. У непасрэднай блізкасці ад Белавежскага нацыянальнага парку, на тэрыторыях, ахопленых праграмамі «Natura 2000», а ў выпадку адной з вёсак – таксама праграмай аховы арлана, мелі быць створаны пляцоўкі для будаўніцтва запоры на польска-беларускай мяжы. Група жыхароў Белавежскай пушчы і яе ваколіц высветліла, дзе на польска-беларускай мяжы кампанія «Budimex» плануе стварыць пляцоўкі для будаўніцтва запор, больш вядомых як мур ці плот. Усяго на пушчанскім участку польска-беларускай мяжы «Budimex» планаваў два каардынацыйныя пункты будаўнічых работ і захоўвання матэрыялаў для будаўніцтва гэтай дамбы: у Белавежы і Старым Масеве. Такі пляц планавалі стварыць і ў ваколіцах Ялоўкі (гміна Міхалова ў Беластоцкім павеце). Белавежа і Старое Масева знаходзяцца ў непасрэднай блізкасці ад Белавежскага нацыянальнага парку. Гэтыя тэрыторыі ахоплены праграмамі «Natura 2000», а Старое Масева дадаткова ахоплівае праграма аховы арлана. Напрыклад, у Старым Масеве, між іншым, размясцілася б цяжкая тэхніка, тут працавалі б бетонамяшалкі. Работы на гэтай будаўнічай пляцоўцы працягваліся б 24 гадзіны ў суткі. Група жыхароў Белавежскай пушчы падрыхтавала зварот аб пераносе гэтых складоў за межы буфернай зоны Пушчы.

У звароце з подпісамі, накіраваным органам мясцовага самакіравання і «Будзімэксу» чытаем: «Паводле звестак, апублікаваных Памежнай аховай, 25 студзеня пачнецца бу-





даўніцтва агароджы ўздоўж польска-беларускай мяжы. Ка-мпанія «Budimex», якая адказвае за будаўніцтва на ўчастках Белавежскай пушчы, зараз заключае дагаворы на арэнду зямлі і размяшчэнне будаўнічых дэпо і офісаў. Агульны кошт будаўніцтва плота, закантрактаваны на 1,233 мільярда злотых, не прадугледжвае негатыўных наступстваў для прыроды». Пералічана: «У пунктах каардынацыі плануецца: склады агрэгатаў, пяску і сталі, неабходных для будаўніцтва плота і памежнай дарогі. На будаўніцтва агароджы мяркуецца выкарыстаць 50 тысяч тон сталі і дзясяткі тысяч тон запаўняльніка, што цягне за сабой неабходнасць перавозкі тысяч грузавікоў, неабходных для перавозкі матэрыялаў на будаўнічую пляцоўку, іх захоўвання на складах і транспарціроўкі аўтамабілямі ў памежную зону – месца будаўніцтва плота. Стануць бетонамяшалкі – пункты вытворчасці бетону для падмуркаў агароджы. Будуць стаянкі для цяжкай будаўнічай тэхнікі». Згодна з інфармацыяй, атрыманай жыхарамі Старога Масева ва ўправе гміны Нараўка, кампанія «Будзімэкс» у дагаворах на стварэнне гэтых будаўнічых пляцовак бярэ на сябе абавязацельства ліквідаваць шкоду, нанесеную будаўніцтвам і выкарыстаннем мясцовых дарог. У гэтым кантэксце ў звароце гаворыцца: «На жаль, мы не атрымалі інфармацыі, у якой ступені абавязацельствы «Budimex» эфектыўна забяспечаны дагаворнымі штрафамі, якія гарантуюць своечасовае і эфектыўнае пакрыццё шкод». У звароце падкрэслівалася: «Будаўніцтва плота непазбежна пацягне за сабой нязручнасці для мясцовай супольнасці, але найбольшая асцярога – незваротная шкода прыродзе. Белавежская першабытная пушча і яе наваколле – унікальны прыродны аб'ект у глабальным маштабе, адзіны ў Польшчы, занесены ў спіс ЮНЕСКА, месца, якое, як грамадзяне, мы кахаем і адчуваем абавязак абараняць. Будаўнічыя работы і інтэнсіўнае выкарыстанне ўчастка негатыўна адаб'юцца на мясцовай флоры і фаўне». Нагадваюць: «На жаль, у Законе аб будаўніцтве аховы дзяржаўнай мяжы ад 29 кастрычніка 2021 года гаворыцца, што «на інвестыцыі не распаўсюджваюцца асобныя палажэнні, у тым ліку заканадаўства аб будаўніцтве, воднае права, прыродаахоўнае права і нарматыўныя акты аб раскрыцці інфармацыі аб навакольным асяроддзі», геадэзічнае і картаграфічнае права, палажэнні аб тэрытарыяльным планаванні і забудове, палажэнні аб ахове зямель сельскагаспадарчага і ляснога прызначэння і прыродаахоўных зямель, палажэнні аб чыгуначным транспарце, палажэнні аб спецыяльных правілах падрыхтоўкі і ажыццяўлення інвестыцый у галіне аўтамабільных дарог агульнага карыстання». Жыхарам не быў прадстаўлены ні план будаўніцтва, ні праект, і не было ніякай сустрэчы з інфармацыяй аб мерапрыемствах, якія плануюцца ў нашым бліжэйшым асяроддзі. «Як жыхары, якія тут жывуць, ад месяцаў назіраем за дзейнасцю ў закрытай зоне, мы ўсведамляем, што не спынім будаўніцтва плота, але лічым, што можам мінімізаваць негатыўныя наступствы гэтай інвестыцыі ў прыродзе. Просім падтрымкі ў мерапрыемствах, якія дапамогуць арганізаваць будаўніцтва, захоўванне і вытворчасць матэрыялаў такім чынам, каб як мага менш пераашкаджаць прыродзе, з улікам буфернай зоны Белавежскага нацыянальнага парку, тэрыторый праграмы «Natura 2000» і абароны арлана. У цяперашні час улічваюцца толькі мінімальныя фінансавыя выдаткі, адсюль і размяшчэнне пунктаў каардынацыі і захоўвання матэрыялаў як мага бліжэй да мяжы. Наш прыярытэт і мэта – перамясціць гэтыя пункты ў месцы, дзе яны не будуць сутыкацца з экасістэмай Белавежскай пушчы і яе ваколіцамі. Мы ўсведамляем, што гэта можа павялічыць эканамічны кошт праекта, але менавіта выдаткі на ахову прыроды павінны быць улічаны як частка нашай грамадзянскай адказнасці за экасістэму, унікальную ў глабальным маштабе».

Згодна з ранейшымі запэўненнямі прадстаўнікоў урада і яго паўнамоцнага прадстаўніка па будаўніцтве плота інжынера Марка Хадкевіча, «мур» на польска-беларускай мяжы (даўжыня 186 км і вышыня больш за 5,5 метра) павінен быць гатовы ў



чэрвені. У студзені падпісалі тры кантракты, звязаныя з будаўніцтвам мура на мяжы з Беларуссю з «Budimex» і кансорцыумам кампаній «Unibep» і «Budrex». «Budimex» павінен пабудаваць 105,5 км мура-плота, а іншы падрадчык – 80,7 км (пагадненне з кансорцыумам з трох кампаній: «Polimex Mostostal SA», «Mostostal Siedlce Ltd.» і «Węglokoks SA» на будаўніцтва сталёвых пралётаў – для будаўніцтва плота плануецца выкарыстаць больш за 50 тыс. тон сталі). Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі паведаміла, што агулам на выкананне ўсіх работ закантрактавана больш за 1233 мільёны злотых.

Плот будуецца. «Будзімэкс» адмовіўся ад стварэння складоў для гэтай будоўлі ў зоне «Natura 2000» у Старым Масеве. Праўда, прызнаецца, што ў запаведніку будзе мур. У запаведніку – 3 кіламетры муру. Плот будуецца – паводле цяперашніх планаў – толькі на падляшскім участку польска-беларускай мяжы, а гэта 247 км (усёй мяжы – 418 км). З інфармацыі ад прэс-сакратара Галоўнага штаба Памежнай аховы вынікае, што на забалочаных угоддзях лесу яго ўзводзіць не будуць, а значыць, асушваць іх не трэба (“асушваць балоты не плануем”). Шырыня памежнай паласы, на якой будуецца плот абмежаваны да 8 м – агулам даўжынёй 15 м, лічачы ад лініі мяжы. Але на відэа, апублікаваным у твітары памежнікамі з ваколіц Мельніка, відаць, што будаўнічыя работы на мяжы сягаюць больш за 8 метраў. Няма адказу на пытанне, колькі дрэў будзе высечана. Дрэвы ў Пушчы маюць вырэзвацца «там, дзе будзе гэта абсалютна неабходнае». Дзе канкрэтна ў Белавежскай пушчы будуць пілаваць дрэвы «абсалютна неабходныя» і колькі можна іх спілаваць, няма адказу. Прэссакратар памежнай аховы Анна Міхальская: «Гэтая тэрыторыя ў асноўным бязлесная, расчышчаная. У строгім запаведніку мур будзе ўстаноўлены на ўчастку даўжынёй каля 2,7 км, пры гэтым неабходная для будаўніцтва муру паласа шырынёй 8 м не пакрываецца густым лесам. Памятайце, што гэта месцы, якія пастаянна патрулююцца супрацоўнікамі памежнай службы з мэтай праверкі незаконнага перасячэння мяжы, да большасці з іх можна дабрацца на службовым аўтамабілі. Пагранічнікі прыкладаюць усе намаганні, каб пры будаўніцтве муру было як мага менш умяшання ў навакольнае асяроддзе, бо гэта наша штодзённае месца службы. Служэнне ў запаведніках або нацыянальных парках з’яўляецца адным з найбольш важных каштоўнасцей нашай службы, і мы клапоцімся аб гэтым прыродным асяроддзі. Міністр, адказны за ахову навакольнага асяроддзя, пастаянна ўдзельнічаў у працы брыгады, прызначанай для ўзвядзення мура, мы пастаянна кантактуем з леснікамі і супрацоўнікамі Белавежскага нацыянальнага парку».

Прадстаўнік «Будзімэксу» **Міхал Вжосэк** прадбачыў, што шукаецца іншая лакалізацыя пляцу экалагічнага складу, далей ад забудоў вёсак, але ў ваколіцах Старога Масева. «Будзімэкс» ажыццяўляе інвестыцыі ў розных экалагічна патрабавальных галінах і мае вялікі вопыт у гэтай галіне. Мы таксама праводзім будаўнічыя работы ў ахоўных тэрыторыях «Natura 2000» у іншых месцах Польшчы. Мы будзем кантраляваць усю працу сваімі службамі».

Тэхнічная дакументацыя, прадстаўленая пагранічнікам выканаўцамі плота, ахоплівае першыя ўчасткі, гэта значыць больш за 20 км. Тут пачынаюцца работы з бетанавання паляў у зямлі. У той жа час у Седльцах вырабляюць сталёвыя пралёты. Гэта асноўныя элементы плота.

Плот на мяжы з Беларуссю вышынёй больш за 5,5 метра павінен быць гатовы ў чэрвені гэтага года.

**Уладзімеж Цімашэвіч**: – Я злосны на гэты плот. За агароджай прысядзібнага ўчастка, дзе жыву ў Белавежжы, стварылі сховішча для абсталявання для будаўніцтва гэтага муру... Даводзіцца да таго, што падзяляецца непадзельнае асяроддзе з усімі яго наступствамі. Цяпер падзеліцца Еўропа сапраўднай жалезнай заслонай. З пункту гледжання палітычнага сігналу гэта драматычная памылка». Ужо 26 студзеня выйшлі людзі супраць будаўніцтва тае новае жалезнае заслоны: «Puszcza zielona – niepodzielona»! Супраць гэтай трагічнай задумы новага падзелу жывой Пушчы жыхары Белавежжа, усёй краіны і паўтысячы навукоўцаў з усяго свету.

**Міра Лукша**

fot. **media internetowe**

# Krzyż uchodźców

W tym roku mija sto lat od zakończenia wielkiego exodusu naszych przodków – bieżeństwa. Ich powroty rozpoczęły się, co prawda, już w 1918 roku, ale dopiero Traktat Ryski z marca 1921 roku formalnie otworzył im taką możliwość. Ale droga do domu nie była łatwa i szybka, trwała często wiele miesięcy, wliczając okres kwarantanny na granicy. Dlatego część bieżeńców dotarła w strony rodzinne dopiero w 1922 roku, a nawet później. I oto teraz, nam, ich wnukom i prawnukom, dane jest współprzeżywać bieżeństwo na nowo. Bo czyż obojętny może być człowiek, kiedy za węgłem twego domu lub w okolicznym lesie leży wycieńczony, mokry, zamarzający człowiek, osaczony przez ludzi w mundurach jak dziki zwierz.

Opowiadał mi znajomy, że do jednego domu we wsi Wyczółki w parafii zubackiej zapukał taki człowiek – uchodźca. Gospodarz go wpuścił i postawił na stół jedzenie. Nieoczekiwany gość się ukłonił, przeżegnał trzema palcami, pomodlił i dopiero wówczas usiadł do jedzenia. Po spożyciu posiłku prawosławny Syryjczyk niskim ukłonem podziękował gospodarzowi i udał się w swoją stronę. A może był to sam Chrystus?

Znajoma osoba, w odruchu serca zajmująca się pomaganiem takim uchodźcom, pokazała mi wspólną fotografię z pięcioma z nich, także Syryjczykami. Trzech z nich to prawosławni, dwóch to muzułmanie. Tylko te dwie sytuacje z życia wzięte pokazują, że wśród syryjskich uchodźców, którzy przez Białoruś trafili na Podlasie, co najmniej połowa to wyznawcy prawosławia, nasi bracia w Chrystusie.

Wracając do naszych przodków, to okrucieństwa pierwszej wojny światowej wygnały ich w sierpniu 1915 roku z rodzinnych stron. Kręte drogi zaprowadziły nad Dniepr, Wołgę, Don i daleko za Ural. Tam też wielu pozostało, tak jak mój pradziadek **Paweł Sacharewicz-Kondratiuk**, który zmarł w 1917 roku w Bazarnym Karabułaku w guberni saratowskiej. Prababcia **Anastazja** wraz z dziećmi powróciła do Studziwód dopiero latem 1921 roku, już po Traktacie Ryskim. Po sześcioletnim okresie niebytności, członkowie mojej rodziny na miejscu domu zastali jedynie fundamenty, a na polach rosły młode brzozy.

W podobnej sytuacji znalazły się setki, a może nawet tysiące uchodźców powracających do swych rodzinnych miejscowości – wszystko trzeba było zaczynać od nowa. Musieli liczyć na siebie i pomoc tych, którzy nie wyjeżdżali, bo państwo powracających uchodźców wspierało mizernie. Na odwrót, Białorusini, szczególnie prawosławni, stali się obywatelami drugiej, a nawet trzeciej kategorii. Najważniejsze jednak było to, że tu powrócili. I dlatego my – podlascy Białorusini, jesteśmy i nadal tworzymy ten niepowtarzalny zakątek dawnej Rzeczypospolitej – różnorodnej, wielokulturowej, otwartej...

Jesteśmy, bo oni wrócili... Dlatego pamięć o krzyżu uchodźczym naszych przodków sprzed ponad stu lat jest jednym z ważniejszych aspektów naszej tożsamości. Podobnie jak dla Ormian, dla których takim wyznacznikiem jest exodus roku 1915.

Odwiedzając często jako dziecko dom dziadków, słyszałem opowieści o uchodźstwie – „bieżeństwie”. Były trochę jak bajki, pobudzające wyobraźnię, odkrywające nieznane, geograficzne przestrzenie. Daleka Wołga stawała się bliska, a ludzie tam mieszkający, którzy naszych uchodźców przyjmowali w swych domach, byli jakby na wyciągnięcie ręki. Te kilka lat z dzieciństwa wujka **Jakuba** czy babci **Krystyny**, spędzonych na uchodźstwie, odcisnęło na ich świadomości pozytywne skojarzenia. Chociaż potem rozpoczął się rewolucyjny chaos, to te pierwsze dwa, trzy lata pobytu na obczyźnie jawiły się czasem stabilnym. Bo wówczas wiele dobroci spotkało tam uchodźców od ludzi różnych narodowości. Przecież nad Wołgą nie mieszkali tylko Rosjanie, ale także Tatarzy, Kazachowie, Mordwini i ludzie innych narodowości.

Kiedy dziś do Puszczy Białowieskiej i na jej przedpola napływają uchodźcy z dalekich krajów, wielu ludzi od nas stara się im pomagać. Bo sami jesteśmy potomkami uchodźców w trzecim, czwartym pokoleniu i chyba lepiej rozumiemy ich doświadczenia. Niestety, przedstawiciele systemu, w tym media, starają się temu normalnemu odruchowi serca przeszkadzać. Osoby, zajmujące się ratowaniem życia i zdrowia uchodźców czy też migrantów, są nierzadko szykanowane.

W listopadzie 2021 roku głośna stała się sprawa hejtu medialnego wymierzonego przeciwko **Katarzynie Wappie**, nauczycielce z Hajnówki i jednocześnie podlaskiej Białorusince. Przyczyną stał się materiał, zamieszczony na oficjalnej stronie internetowej stacji TVP Info. W materiale tym skrytykowano jej zaangażowanie w pomaganie uchodźcom i migrantom, którzy utknęli w regionie Puszczy Białowieskiej. TVP Info z premedytacją wskazała, że Katarzyna Wappa brała wcześniej udział w kampanii „Ja Biełarus”, promującej podawanie przynależności do białoruskiej mniejszości narodowej w Spisie Powszechnym Ludności i Mieszkań. A przecież w tej kampanii, którą zainicjowała białostocka Fundacja „Tutaka”, wzięło udział kilkudziesięciu innych przedstawi-

cieli białoruskiej mniejszości narodowej z Polski. Ich wypowiedzi są dostępne na stronie internetowej tejże fundacji. Jak wiadomo, również Główny Urząd Statystyczny oficjalnie zachęcał do deklarowania przynależności narodowej w Spisie Powszechnym Ludności i Mieszkań 2021.

Materiał zamieszczony przez TVP Info na swej stronie internetowej środowiska białoruskiej mniejszości narodowej przyjęły z oburzeniem i wydały 24 listopada 2021 roku specjalne oświadczenie. Podpisało je dziewięciu liderów organizacji białoruskich. Sygnatariusze dokumentu zwrócili uwagę na okoliczność, iż: „Zestawienie wypowiedzi Pani Katarzyny Wappy na temat uchodźców oraz migrantów z jej deklaracją o przynależności do białoruskiej mniejszości narodowej odbieramy jako niewłaściwe oraz stygmatyzujące nas jako obywateli tego państwa. Jednym z celów akcji „Ja Biełarus!” było przezwyciężenie stygmatyzacji mniejszości białoruskiej, która jest jednym z czynników wpływających na zmniejszenie liczby naszej społeczności wykazanej w spisie 2011 roku w stosunku do poprzedniego z 2002 roku. Jako przedstawiciele organizacji białoruskich działających w Polsce nie zgadzamy się na insynuowane zarzuty oraz interpretowanie wypowiedzi w kontekście przynależności narodowej na antenie publicznego nadawcy, którego misją wynikającą z ustawy o radiofonii i telewizji jest także uwzględnienie potrzeb mniejszości narodowych i etnicznych zamieszkujących w Polsce”.

Sygnatariusze oświadczenia przypomnieli też – w pozytywnym kontekście – słowa prezydenta RP **Andrzeja Dudy**, wypowiedziane w czerwcu 2021 roku w Bielsku Podlaskim, podczas spotkania z przedstawicielami białoruskiej mniejszości narodowej: „Niestety, jest prowadzonych wiele działań, by skłócić nasze narody, a przecież jesteśmy obywatelami jednej Rzeczypospolitej. Chciałbym bardzo, abyśmy do takiej sytuacji nie dopuścili”.

W konkluzji oświadczenia liderzy organizacji napisali: „Jesteśmy przeciw wykorzystywaniu polskich obywateli narodowości białoruskiej na potrzeby budowania bieżącej narracji politycznej”.

Jedną z osób zaangażowanych w przygotowanie powyższego oświadczenia liderów mniejszości białoruskiej był **Tomasz Sulima**, dziennikarz i samorządowiec. Już wcześniej nie krył krytycyzmu wobec stanowiska prorządowych mediów w kwestii uchodźców i działań służb mundurowych w rejonie przygranicznym. I to nie spodobało się części bielskich radnych, którzy postanowili odwołać Tomasza Sulimę z funkcji wiceprzewodniczącego Rady Miasta Bielsk Podlaski. I to się im, niestety, podczas sesji RM w dniu 30 listopada ubiegłego roku, udało.

* * *

Kwestia obrony dobrego imienia Katarzyny Wappy pokazuje, że podlascy Białorusini są wyczuleni na przejawy instrumentalnego ich traktowania. Jako obywatele polscy i gospodarze swej ziemi nie chcą być wykorzystywani do koniunkturalnych rozgrywek. Są przy tym otwarci i wrażliwi na punkcie zachowania godności ludzkiej. I nie chodzi tu tylko o pomaganie osobom z dalekich krajów, które znalazły się w przygranicznym potrzasku. U wielu ludzi stąd głębokie oburzenie wywołuje tworzenie policyjno-wojskowego „rezerwatu” w trzykilometrowej *zonie* przy granicy Polski z Białorusią.

Od września 2021 roku zamarło w naszym, przygranicznym regionie szeroko rozumiane życie społeczne, a mieszkańcy *zony*, w większości polscy Białorusini, stali się swoistymi zakładnikami nowej sytuacji politycznej. Przykładowo Białorusin z Bielska Podlaskiego od września 2021 roku ma dosłowny zakaz odwiedzania w tej strefie swoich znajomych, np. w Białowieży czy Klukowiczach (chyba że mieszka tam bliska rodzina lub udaje się na pogrzeb). Ponadto białoruskie (i inne) organizacje spoza *zony* nie mogą prowadzić na tym obszarze praktycznie żadnych przedsięwzięć kulturalnych. Można więc mówić otwarcie o pogwałceniu podstawowych praw mniejszości narodowych w zakresie pielęgnowania swojej kultury, co przecież gwarantuje polskie ustawodawstwo.

